**ПАРАСКЕВА-ПЯТНІЦА**, святая пакутніца, апякунка жанчын, дзяўчат, шлюбу, а таксама прадзіва. Ушаноўваюць 10 лістапада н.ст. Мяркуецца, што ў язычніцкай міфалогіі ёй папярэднічала блізкая па функцыях старажытная багіня *Мокаш*, выцесненая П.-П. з 12—13 ст. У дзень П.-П. забаранялася выконваць розныя работы: араць, выносіць попел, рабіць луг для мыцця бялізны, але найперш прасці і ткаць. У розных мясцінах апошняя забарона магла распаўсюджвацца на пятніцы перад усімі дванадзесятымі святамі, перад Пятром і Паўлам, Іллёю, Пакровам, а то і на ўсе пятніцы на працягу года. Існавала вера ў 12 пятніц у годзе і адмысловы апакрыфічны (не зацверджаны царквою) пятнічны каляндар: напрыклад, святкавалі ў гонар П.-П. 8-ю, 9-ю, 10-ю і 12-ю паслявелікодныя пятніцы. На Усходнім Палессі мясцовыя святары некалі тлумачылі пазбяганне выконваць пэўныя інш. работы тым, што татары ў свой час прымушалі хрысціян шанаваць свайго бога і святкаваць пятніцы, чаго народ не прытрымліваўся; аднак, даведаўшыся, што ў святцах ёсць святая Параскева, якую звалі Пятніцай (грэчаскае para Skeue азначае «пятніца»), аб'яднаў іх у адно паняцце. Як казалі ў народзе, ад прадзення ў гэты дзень цела П.-П. пакрываецца ранамі ад уколаў верацёнаў, і святая просіць не мучыць. Пры парушэнні жанчынамі забароны абразы з выявай святой П.-П. пакрываюцца пылам. Паводле нар. павер'яў, парушальніц П.-П. можа пакараць, вылезшы з-пад печкі ці заявіўшыся ў хату ў выглядзе старэнькай бабы. У дзень П.-П. жанчыны неслі ёй у храм ахвяру — пяршыну лёну, кавалак палатна ці навешвалі на яе абраз ручнік, які, павісеўшы нейкі час, атрымліваў гаючую сілу, і тыя, хто маліўся, выціралі ім твар і хворыя вочы. П.-П. апекавалася таксама вадою, асабліва крыніцамі і калодзежамі. На землях усходніх славян у многіх мясцінах ставілі ля калодзежаў драўляныя скульптуркі П.-П. або вешалі яе абразы, а ў ахвяру гэтай святой кідалі ў ваду льняную кудзелю, авечую воўну, выпрадзеныя ніткі, а таксама манеты, пацеркі, завушніцы, пярсцёнкі. Паводле паданняў, ля некаторых крыніц, названых потым «пятніцкімі», з'яўляліся цудадзейныя абразы П.-П., і вада з тых крыніц валодала вялікай сілаю, а ля тых мясцін, куды збіраліся людзі, часам ідучы пешшу дзесяткі вёрст на пакланенне ёй, узводзілі капліцы, праводзілі хрэсны ход, водасвяцце з малебнамі «за здароўе і ўспамін людзей», «за скацінку». Дзень П.-П. прыпадаў на пару восеньскіх вяселляў, і дзяўчаты на Заходнім Палессі звярталіся да святой па дапамогу: «Пяцёнка, мая мацёнка, памажы хоч ты, каб мне замуж пайты». Імя П.-П. згадваецца ў нар. казках, легендах, павер'ях.

*Літ.*: Легенды і паданні. Мн., 1983. С. 135—140; Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 547—548; Лозка А. Беларускі народны каляндар. Мн., 1993. С. 179; Зайкоўскі Э.М., Дучыц Л.У. Жыватворныя крыніцы Беларусі. Мн., 2001. С. 10, 17, 27, 38—41.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ